# 4 ГАДЫ РЭПРЭСІЙ У БЕЛАРУСІ Ў ЦЭЛЫМ І Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ

## ТЭНДЭНЦЫІ

**ЧЭРВЕНЬ 2020 – ЧЭРВЕНЬ 2024 ГОДА**

Падрыхтаваў Беларускі ПЭН

**(2020–2023)**

Затрымалі і адпусцілі без пратакола
Добра, што толькі тры дні, але не штраф
Добра, што не білі
Добра, што штраф, а не суткі
Добра, што суткі, але хаця з матрацам
Добра, што 15 сутак, але не 30
Добра, што не білі
Добра, што 90 сутак, а не крыміналка
Добра, што крыміналка, але не білі
Добра, што «хатняя хімія», а не «хімія»
Добра, што «хімія», а не гады ў зняволенні
Добра, што два-тры гады, а не дзясятак
Добра, што ў СІЗА, а не ў калоніі
Добра, што агульны рэжым, а не ўзмоцнены
Добра, што ёсць лісты, хоць і ўзмоцнены
Добра, што ў калоніі, а не ў ПКТ
Добра, што ў ПКТ, а не ў ШЫЗА
Добра, што ў ШЫЗА, але здаровы
Білі, але хаця б здаровы
Добра, што выйшаў, цяпер плануем лячэнне

Яшчэ сядзіць, але хаця б жывы

*Таццяна Нядбай*

© БЕЛАРУСКІ ПЭН

**Уводзіны ........................................................................................................................ 4**

**Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў цэлым і ў сферы культуры ў прыватнасці ў міжнародных і нацыянальных індэксах ................................ 5**

**Статыстыка пераследу дзеячаў культуры ..................................................... 8**

**Тэндэнцыі рэпрэсій у краіне ў цэлым і ў сферы культуры ў прыватнасці: 2020 – чэрвень 2024............................................................................... 10**

**Дзесяць абсурдных прыкладаў парушэння культурных правоў і правоў чалавека ў дачыненні да дзеячаў культуры .................................................. 15**

**Высновы ........................................................................................................................ 18**

© БЕЛАРУСКІ ПЭН

Станам на канец чэрвеня 2024 года ў Беларусі 1413 палітычных зняволеных і сітуацыя з правамі чалавека, у якой краіна апынулася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2020 года, працягвае пагаршацца. Агулам, паводле звестак[1] праваабарончага цэнтра «Вясна», за чатыры гады рэпрэсій, што мінулі з моманту затрымання палітычнага дзеяча, блогера, менеджара культуры Сяргея Ціханоўскага, які зрабіўся першым палітзняволеным за падзеі 2020 года, паводле крымінальных спраў вынесены мінімум 5133 палітычныя прысуды; мінімум 36 418 чалавек зазналі адміністрацыйны пераслед; больш за 400 беларусаў унесены ў спіс «тэрарыстаў», 4100 прызнаны «экстрэмістамі»; 1012 чалавек ужо цалкам адбылі тэрміны і выйшлі на волю; 6 чалавек памерлі за кратамі…

Рэпрэсіі закранаюць людзей усіх узростаў, гендараў, узроўняў здароўя, дастатку, статусу, сацыяльнай актыўнасці, прафесій – пераследуюцца дзеячы культуры, журналісты, адвакаты, спартсмены, медыцынскія працаўнікі, прадстаўнікі акадэмічнай супольнасці, рабочыя, вернікі і многія іншыя прафесійныя і сацыяльныя групы людзей, а таксама цэлыя супольнасці.

У кастрычніку 2019 года Беларускі ПЭН пачаў весці маніторынг парушэнняў правоў у сферы культуры, першапачаткова скіраваны на выяўленне, фіксацыю і аналіз парушэнняў дзеля наступнага абмеркавання сітуацыі ў прафесійным асяроддзі, узаемадзеяння з дзяржаўнымі органамі і выпраўлення сітуацыі ў культурным полі Беларусі. Рэальнасць 2020 года – грамадска-палітычны і прававы крызіс – прывяла да іншага дыскурсу і характару парушаных правоў у дачыненні да дзеячаў культуры, як і да немагчымасці дыялогу з дзяржаўнымі органамі, у адказ на што маніторынг перафарматаваўся ў фіксацыю і аналіз рэпрэсій супраць людзей культуры. Так, ужо на працягу чатырох гадоў мы збіраем выпадкі палітычна матываванага пераследу дзеячаў культуры – адвольныя затрыманні, арышты, адміністрацыйны і крымінальны пераслед, як і факты цэнзуры, абмежавання доступу да аўдыторыі, забароны на прафесію адбываюцца ў Беларусі штодня, і ўсё новыя людзі трапляюць пад жорны рэпрэсій.

У гэтым матэрыяле мы:

- звернемся да міжнародных і нацыянальных індэксаў, каб убачыць, як за чатыры гады пагоршылася сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі ў цэлым і з культурнымі правамі ў прыватнасці;
- паглядзім, якая мінімальная колькасць дзеячаў культуры ўжо закранута рэпрэсіямі;
- прааналізуем, як пераслед змяніўся з цягам часу;
- убачым, наколькі абсурднае тое, што адбываецца ў краіне, дзе людзей саджаюць у турму за смайлікі ў сацыяльных сетках, а галоўныя «спецыялісты» ў арганізацыі культурна-відовішчных мерапрыемстваў – куратары з Камітэта дзяржаўнай бяспекі: *«У кожнай культурніцкай установы ёсць свой куратар КДБ, які сочыць за праграмай і яе ўзгадняе. Наша кіраўніцтва так і казала нам: “Прыходзіў куратар і сказаў гэтае і гэтае не рабіць і не спяваць”»*[2].

[1] Станам на 29 траўня 2024 года.

[2] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2024 года.


© БЕЛАРУСКІ ПЭН

# СІТУАЦЫЯ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ Ў ЦЭЛЫМ І Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ Ў ПРЫВАТНАСЦІ Ў МІЖНАРОДНЫХ І НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ІНДЭКСАХ

Згодна з дакладам Вярхоўнага камісара Арганізацыі Аб’яднаных Нацый па правах чалавека, «у перыяд з 1 траўня 2020 года да 31 снежня 2023-га ў Беларусі працягвалі здзяйсняцца шматлікія парушэнні міжнароднага права ў галіне правоў чалавека, у прыватнасці, на падставе рэальных або меркаваных палітычных поглядаў. Ацэньваючы сукупнасць усіх доказаў, сабраных за 3 гады, ёсць разумныя падставы меркаваць, што было здзейснена злачынства супраць чалавечнасці ў форме пераследу».

Як на краіне, якая ніколі не была ў топе рэйтынгаў палітычных правоў і грамадзянскіх свабод, адбіліся чатыры гады рэпрэсій? Паглядзім на дынаміку міжнародных рэйтынгаў і нацыянальных індэксаў.

## РЭЙТЫНГ СВАБОДЫ Ў СВЕЦЕ (FREEDOM IN THE WORLD)

Даследчыкі *«Freedom House»* ацэньваюць, наколькі поўна жыхары той ці іншай краіны могуць рэальна карыстацца кожным з палітычных правоў і грамадзянскіх свабод, згаданых у Сусветнай дэкларацыі правоў чалавека. За кожны з 10 паказчыкаў палітычных правоў і 15 паказчыкаў грамадзянскіх свабод краіна можа атрымаць ад 0 да 4 балаў, у выніку максімальна магчымы лік балаў свабоды ў рэйтынгу – 100. У 2019 годзе Беларусь набрала 19 балаў са 100 магчымых. На працягу апошніх трох гадоў – 2022, 2023, 2024-га – ужо ўсяго 8 з 100: 2 з 40 магчымых у палітычных правах і 6 з 60 – у грамадзянскіх свабодах. **Сёння Беларусь займае апошняе месца ў рэйтынгу свабоды сярод дзяржаў Еўропы.**

## СУСВЕТНЫ ІНДЭКС СВАБОДЫ ПРЭСЫ (WORLDWIDE PRESS FREEDOM INDEX)

Міжнародная няўрадавая арганізацыя *«Рэпарцёры без межаў»* (*Reporters Without Borders, RSF*) выпускае рэйтынг стану свабоды прэсы ў кожнай канкрэтнай краіне свету. Індэкс размяркоўвае дзяржавы паводле ступені свабоды прэсы ў балах ад нуля (найгоршы магчымы ўзровень) да 100 (найлепшы). Ад індэкса 51,66 і статусу «дрэнна» ў 2019 годзе Беларусь апусцілася да 37,17 і «вельмі дрэнна» ў 2023-м. **На сёння яна займае 157-ы радок рэйтынгу са 180 краін свету.**

## ІНШЫЯ МІЖНАРОДНЫЯ ІНДЭКСЫ

**Freedom to Write Index.** *PEN America* штогод публікуе справаздачу, дзе адсочваюцца затрыманні і турэмнае зняволенне пісьменнікаў, навукоўцаў і грамадскіх інтэлектуалаў ва ўсім свеце, якія за апошні год утрымліваліся ў турме або пад вартай за сваю пісьменніцкую дзейнасць ці ажыццяўленне свабоды выказвання думкі. Беларусь, якая нават не згадвалася ў індэксе 2019 года, **з 2020-га нязменна прысутнічае**







© БЕЛАРУСКІ ПЭН

**ў Топ-10 краін з самай высокай колькасцю пісьменнікаў (пісьменніц), якія знаходзяцца ў зняволенні**, а паводле вынікаў 2023 года займае ў ім шостае месца[3].

**Press Freedom in Europe.** Згодна з дакладам арганізацый – партнёраў платформы *Рады Еўропы* (РЕ) па садзейнічанні абароне журналістыкі і бяспецы журналістаў, у 2024 годзе Беларусь **займае першае месца ў Еўропе паводле колькасці журналістаў, якія знаходзяцца ў зняволенні**[4].

Згодна з **ITUC Global Rights Index**, рэйтынгам *Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў* за 2024 год, Беларусь **знаходзіцца ў Топ-10 найгоршых краін паводле выканання правоў працоўных у свеце**[5].

## НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ

### Нацыянальны індэкс правоў чалавека

Група экспертаў грамадзянскай супольнасці пад агульнай каардынацыяй *Беларускага Хельсінкскага камітэта* стварае Нацыянальны індэкс правоў чалавека ў краіне, які ўяўляе сабой ацэнку сітуацыі з правамі чалавека ў трох катэгорыях: грамадзянскія і палітычныя правы; сацыяльныя, эканамічныя і культурныя правы; агульныя меры ў галіне правоў чалавека. Эксперты ацэньваюць актуальную сітуацыю і тое, наколькі яна суадносіцца з ідэальнай. У адпаведнасці з гэтым выстаўляецца ацэнка паводле 10-бальнай шкалы, дзе 1 – рэальнасць ніяк не суадносіцца з ідэальным станам, 10 – ідэальны стан і рэальнасць супадаюць. **У 2019 годзе Нацыянальны індэкс правоў чалавека склаў 4,1 бала, у 2023-м – ужо 2,4 з 10 магчымых.**

Адна з галін, дзе пагаршэнне найбольш моцнае, – права на ўдзел у культурным жыцці. Гэты індэкс вылічваецца паводле ацэнкі 4 кампанентаў: удзел у культурным жыцці, доступ да культурнага жыцця, магчымасць рабіць унёсак у культурнае жыццё і ахова культурнай разнастайнасці. Так, з **4,6 у 2019 годзе ацэнка права на ўдзел у культурным жыцці знізілася да 1,4 з 10 у 2023-м**.







### Маніторынг рэалізацыі Рэспублікай Беларусь Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці формаў культурнага самавыяўлення

*Цэнтр еўрапейскай трансфармацыі* ладзіць даследаванне культурнай сферы Беларусі ў рамках маніторынгу рэалізацыі Рэспублікай Беларусь Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове і заахвочванні разнастайнасці формаў культурнага самавыяўлення. Ацэнка праводзіцца паводле пяці практычных вымярэнняў, якія адлюстроўваюць закладзеныя ў Канвенцыі мэты і прынцыпы, а таксама змены ў разгортванні культурнай палітыкі дзеля дасягнення гэтых мэтаў і рэалізацыі прынцыпаў: умовы для развіцця і праявы культурнай разнастайнасці; уплыў сектара культуры на развіццё грамадства; унутраныя рэсурсы і патэнцыял развіцця сферы культуры; развіццё міжкультурнага ўзаемадзеяння і кантактаў; узаемадзеянне суб'ектаў культурнай палітыкі. Шкала ацэнак размеркавана ад 0 да 30 балаў, дзе 0 адпавядае поўнай адсутнасці развіцця ў гэтым вымярэнні, а 30 балаў – практычна поўнай рэалізацыі ўсіх установак і

---

[3] Згодна са справаздачай – 16 чалавек.

[4] Згодна са справаздачай, станам на 31 снежня 2023 года як мінімум 37 журналістаў былі ў зняволенні ў сувязі са сваёй прафесійнай дзейнасцю.

[5] Згодна са справаздачай, у зняволенні знаходзяцца 42 прафсаюзныя лідары і чальцы прафсаюза.


© БЕЛАРУСКІ ПЭН




прынцыпаў, закладзеных у Канвенцыі ЮНЕСКА. У 2019 годзе ацэнкі былі ў дыяпазоне ад 9,7 да 13,4 балаў з 30 магчымых (нізкі – сярэдні ўзроўні), у 2022-м – ад 5,4 да 8,4 (вельмі нізкі – нізкі ўзроўні). **У 2019 годзе сярэдняе значэнне паводле 5 вымярэнняў, якія ацэньваюць рэалізацыю Рэспублікай Беларусь прынцыпаў, закладзеных у Канвенцыі ЮНЕСКА, складала 11,5 балаў з 30 магчымых, у 2023-м – усяго 6,6.**

# СТАТЫСТЫКА ПЕРАСЛЕДУ ДЗЕЯЧАЎ КУЛЬТУРЫ

Станам на канец чэрвеня 2024 года ў Беларусі 1413 палітзняволеных, сярод якіх **не менш за 105 чалавек – дзеячы культуры**. Усяго ў зняволенні або ў стане абмежавання волі – на «хатняй хіміі» – знаходзяцца не менш за 164 працаўнікоў сферы культуры[6].

Мінімум 69 дзеячаў культуры выйшлі з турмаў, цалкам адбыўшы пакаранне паводле вынесеных ім несправядлівых прысудаў. Гэтыя лічбы, як і ўсе пададзеныя ніжэй, – толькі **ніжняя мяжа колькасці працаўнікоў сферы культуры**, якія трапілі пад тыя ці іншыя віды пераследу: частка рэпрэсій застаецца па-за полем зроку праваабаронцаў і шырокай грамадскасці, не ўсе выпадкі пераследу ўяўляецца магчымым персаніфікаваць, не пра ўсіх дзеячаў культуры на цяперашні момант нам вядома.

Паводле звестак маніторынгу, з 2020 года палітычна матываваны пераслед і цэнзуру зазналі не менш за 1900 прадстаўнікоў сферы культуры.

- Ад рук рэжыму **загінулі** як мінімум 5 дзеячаў культуры. Няма падстаў не лічыць гвалтоўнымі смерці гісторыка, дырэктара ваўкавыскага музея Канстанціна Шышмакова ў жніўні 2020-га; мастака Рамана Бандарэнкі ў лістападзе 2020-га; палітзняволенага актывіста і прамоўтара гісторыі Вітольда Ашурка ў траўні 2021-га. Асабліва жорсткае абыходжанне, неналежнае і нясвоечасовае аказанне медыцынскай дапамогі ў месцах утрымання пад вартай прывялі да смерці палітзняволеных: культурнага менеджара, блогера Мікалая Клімовіча ў траўні 2023-га і мастака Алеся Пушкіна ў ліпені 2023-га.
- **Адвольныя затрыманні** закранулі не менш за 960 дзеячаў культуры (адзін ці больш разоў), адміністрацыйны пераслед – 645 (адзін-два-пяць ці больш разоў), крымінальны – 370 (адзін-два ці больш разоў).
- Ажыццёўлена не менш за 295 **крымінальных прысудаў** (у тым ліку пяць завочных) у дачыненні да 281 дзеяча культуры.
- **Ператрусы** прайшлі не менш чым у 208 працаўнікоў сферы культуры, канфіскацыя маёмасці – у 137.
- Вядома пра арышт маёмасці ў 26 чалавек, **завядзенне спецыяльнага (завочнага) вядзення** ў дачыненні да 17 дзеячаў культуры, якія знаходзяцца не ў Беларусі.
- Не менш за 209 дзеячаў культуры **ўнесены рэжымам** у «Пералік грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян або асоб без грамадзянства, датычных да **экстрэмісцкай** дзейнасці», 31 – у «Пералік арганізацый і фізічных асоб, датычных да **тэрарыстычнай** дзейнасці».
- Зафіксавана інфармацыя пра 450 **звольненых**, 32 **адлічаных** з устаноў адукацыі, 8 **дэпартаваных** дзеячаў культуры.
- На гэтым этапе не ўяўляецца магчымым ацаніць, колькі дзеячаў культуры:
  - прайшлі (і праходзяць) праз **пераслед за грашовыя ахвяраванні** ў фонды падтрымкі рэпрэсаваных у 2020 годзе (і былі вымушаны перавесці дзяржаве сотні тысяч долараў дзеля спынення супраць іх крымінальнай справы паводле артыкула за нібыта фінансаванне экстрэмізму);
  - зазналі (і працягваюць зазнаваць) працэдуры асабліва пільных **наглядаў і допытаў падчас праходжання беларускай мяжы**;

[6] Маніторынг парушэнняў у сферы культуры Беларусі, студзень – сакавік 2024 года.

- трапілі (і трапляюць) пад **цэнзуру** і забарону на распаўсюд прадуктаў сваёй творчасці;
- зазналі (і працягваюць зазнаваць) абразы і **паклёп** у дзяржаўных медыя;
- сышлі ў падполле і самацэнзуру або **пакінулі краіну** дзеля асабістай бяспекі.

Пачынаючы з паслявыбарчага перыяду 2020 года, у Беларусі ліквідаваны або вымушана пераехалі больш за дзясятак незалежных **выдавецтваў**; зачынены значныя арт-прасторы, міжнародныя цэнтры (Інстытут імя Гётэ, Польскі інстытут у Мінску, офіс Амерыканскага цэнтра ў Беларусі і іншыя), камерцыйныя крамы, якія будавалі свой бізнес на продажы тавараў з нацыянальнай (бел-чырвона-белай) сімволікай.

**Ліквідавана** кожная чацвёртая недзяржаўная арганізацыя, сярод якіх дзясяткі найстарэйшых грамадскіх аб'яднанняў Беларусі. Так, 9 жніўня 2021 года быў прымусова ліквідаваны Беларускі ПЭН-цэнтр – арганізацыя, заснаваная яшчэ ў 1989 годзе, на момант ліквідацыі яе ўзначальвала нобелеўская лаўрэатка ў галіне літаратуры Святлана Алексіевіч. Усяго, паводле маніторынгу «Lawtrend», на канец чэрвеня 2024 года страты ў грамадскім сектары складаюць ужо не менш за 1686 інстытуцыяналізаваных формаў некамерцыйных арганізацый, 1051 з якіх не стала ў выніку прымусовай ліквідацыі, у тым ліку 249 НКА, якія мелі дачыненне да развіцця сферы культуры Беларусі.

Да гэтага дня працягваецца як эміграцыя асобных людзей і сем'яў, так і рэлакацыя кампаній і арганізацый. Толькі паводле падлікаў Беларускай асацыяцыі журналістаў, краіну пакінулі не менш за 400 незалежных журналістаў.

# ТЭНДЭНЦЫІ РЭПРЭСІЙ У КРАІНЕ Ў ЦЭЛЫМ І Ў СФЕРЫ КУЛЬТУРЫ Ў ПРЫВАТНАСЦІ: 2020 – ЧЭРВЕНЬ 2024

Асноўны курс дзяржавы – на задушэнне любой формы іншадумства і ўзмацненне кантролю над усімі аспектамі жыцця грамадства. Агульная выснова адносна тэндэнцый рэпрэсій – мяжа дазволенага ўсё больш адсоўваецца.

«Тое, што раней было недапушчальным, нейкія дзеянні з боку прадстаўнікоў улады ці функцыянераў, зараз дапушчальна, і гэтая мяжа ўсе болей і болей адсоўваецца, і тое, што 3 гады таму было ў прынцыпе немагчыма, праз 2 гады стала магчыма – і вось так па кроку ўсё пагаршаецца»[7].

## МАСАВЫ ХАРАКТАР ПЕРАСЛЕДУ І РОСТ КОЛЬКАСЦІ РЭПРЭСАВАНЫХ (АД 103 АСУДЖАНЫХ ПАВОДЛЕ КРЫМІНАЛЬНЫХ СПРАЎ У 2020 ГОДЗЕ ДА 5133 НА КАНЕЦ ТРАЎНЯ 2024-ГА)

«Я ўжо думаю, што працэнтаў трыццаць усіх беларусаў дакладна ўсе падсудныя»[8].

Рэпрэсіі не спыняюцца і на сёння закранаюць не толькі апанентаў палітычнага рэжыму, але часам і яго прыхільнікаў. Толькі за апошні год паводле палітычна матываваных абвінавачанняў асуджаны мінімум 1603 асобы.

Стала прыкметна больш крымінальных спраў паводле абвінавачання ў стварэнні, кіраўніцтве і ўдзеле ў «экстрэмісцкіх фарміраваннях», садзейнічанні і фінансаванні «экстрэмісцкай» дзейнасці; захавалася вялікая колькасць крымінальных спраў за ўдзел у вулічных пратэстах і выказванні ў сеціве.

За год вынесена не менш за 4466 адміністрацыйных пастаноў. Агулам, згодна са звесткамі праваабарончага цэнтра «Вясна», паводле крымінальных спраў вынесены мінімум 5133 палітычныя прысуды, з іх мінімум 2466 чалавек асуджаны за ўдзел у акцыях пратэсту (паводле артыкулаў 342 і 293 Крымінальнага кодэкса). Мінімум 36 418 чалавек зазналі адміністрацыйны пераслед: у 2020–2021 гадах – пераважна за мірныя акцыі, пікеты і выкарыстанне бел-чырвона-белай сімволікі (паводле артыкула 24.23 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, былы 23.34), у 2022–2024 гадах – за падпіскі, перапосты матэрыялаў незалежных медыя (паводле артыкула 19.11 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях, былы 17.11).

Прыклад са сферы культуры:

Расце і колькасць дзеячаў культуры, якіх закранулі рэпрэсіі. Калі ў 2020 годзе ў маніторынгу зафіксаваны 470 чалавек, то станам на чэрвень 2024 года іх колькасць ужо набліжаецца да 1900.

## УЗМАЦНЕННЕ АДКАЗНАСЦІ (АД 30 ДА 100 БАЗАВЫХ ВЕЛІЧЫНЬ ШТРАФУ, АД 15 ДА 30 СУТАК АРЫШТУ; АД АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА ДА КРЫМІНАЛЬНАГА ПЕРАСЛЕДУ; ПАДАЎЖЭННЕ ТЭРМІНАЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ)

«Павялічылі, як гэта сказаць, пераслед за любую праяву грамадзянскай пазіцыі»[9].

З 1 сакавіка 2021 года істотна ўзмацніліся санкцыі за адміністрацыйныя правапарушэнні паводле «палітычных» артыкулаў:

- паводле артыкула 24.23 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях «Парушэнне парадку арганізацыі або правядзення масавага мерапрыемства» (былы 23.34) павялічыўся максімальны памер штрафу з 30 да 100 базавых велічынь (~ 1175 еўра) або 15 сутак арышту, пры паўторным прыцягненні на працягу года – з 50 да 200 базавых велічынь (~ 2350 еўра) або 30 сутак арышту (раней – да 15). Гэта зрабіла такое правапарушэнне самым «небяспечным» пры ацэнцы санк-

[7] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2023 года.

[8] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2024 года.

[9] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2023 года.



© БЕЛАРУСКІ ПЭН

цый – напрыклад, «больш небяспечным» за незаконную прадпрымальніцкую дзейнасць, наўмыснае нанясенне цялеснага пашкоджання, знішчэнне, пашкоджанне гісторыка-культурных каштоўнасцяў.

- ► паводле артыкула 24.3 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях «Непадпарадкаванне законнаму распараджэнню або патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёй службовых паўнамоцтваў» да 2021 года санкцыя прадугледжвала штраф памерам ад 2 да 50 базавых велічынь або адміністрацыйны арышт, пасля 2021 года – ад 2 да 100 базавых велічынь, або грамадскія працы, або адміністрацыйны арышт.

Калі ў 2020 годзе за ўдзел у мірных акцыях пратэсту беларусаў прыцягвалі да адміністрацыйнай адказнасці (паводле артыкула 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях), то з канца 2022 года мае месца практыка прыцягнення ўжо да крымінальнай (артыкул 342 Крымінальнага кодэкса) тых, хто раней быў асуджаны паводле артыкула 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях і выходзіў падчас пратэстаў на праезную частку. Паколькі дэ-юрэ недапушчальна двойчы прыцягваць да адказнасці за адно і тое ж правапарушэнне, пракуратура апратэстоўвае прыцягненне грамадзян да адказнасці паводле адміністрацыйнай справы і стварае такім чынам юрыдычную магчымасць прыцягнуць іх да крымінальнай адказнасці (выпадкі кампенсацыі за незаконнае прыцягненне да адміністрацыйнай адказнасці невядомыя) – дэ-факта адбываецца **падвойнае прыцягненне да адказнасці** за адно «правапарушэнне».

З 2022 года **тэрміны пазбаўлення волі** сістэматычна падаўжаюцца – у прыватнасці, праз завядзенне новых крымінальных спраў за фармальныя парушэнні (паводле артыкула 411 Крымінальнага кодэкса «Злоснае непадпарадкаванне патрабаванням адміністрацыі папраўчай установы»).

Прыклад са сферы культуры:

11 ліпеня 2023 года публіцыст і актывіст Зміцер Дашкевіч меўся выйсці на волю па заканчэнні 1,5-гадавога тэрміну адбыцця пакарання ў калоніі. Аднак у той дзень стала вядома пра яго перавод у следчую турму на падставе новага пераследу – цяпер паводле артыкула 411 Крымінальнага кодэкса.

## УЗМАЦНЕННЕ ЖОРСТКАСЦІ ЎМОЎ УТРЫМАННЯ ПАЛІТЫЧНЫХ ЗНЯВОЛЕНЫХ (АД НАЯЎНАСЦІ СУВЯЗІ І ЛІСТАВАННЯ ДА СТАТУСУ INCOMMUNICADO)

Пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі, якое адбываецца ў беларускіх турмах, робіць значную (часам непапраўную) шкоду здароўю людзей, прыводзячы ў асобных сітуацыях да шпіталізацыі і нават смерці.

З першых паведамленняў пра ўмовы ўтрымання зняволеных, пазбаўленых волі паводле палітычных матываў, паступалі звесткі пра асабліва **жорсткае** з імі **абыходжанне**: выкарыстанне практык пакарання карцарам; змяшчэнне ў штрафны ізалятар (ШІЗА) і памяшканне камернага тыпу (ПКТ); пазбаўленне пасылак або перадач, сустрэч з роднымі і адвакатамі і многіх іншых.

У 2021 годзе грамадскасць даведалася пра візуальную **сегрэгацыю** такіх зняволеных – жоўтую бірку на вопратцы (пастаноўка на прафілактычны ўлік).

З 2022 года пачалі паступаць першыя звесткі пра выкарыстанне практыкі пераводу **з калоніі на турэмны рэжым**, што прадугледжвае максімальную колькасць абмежаванняў для асуджанага і камерныя ўмовы ўтрымання – знаходжанне ўвесь час у чатырох сценах.

У 2023 годзе гэта ўжо поўная ізаляцыя ад вонкавага свету – доўгатэрміновы рэжым **incommunicado** ў дачыненні да пэўных палітзняволеных. І смерці ў зняволенні ў выніку жорсткага абыходжання і неаказання належнай медыцынскай дапамогі (Мікалай Клімовіч, Алесь Пушкін; у 2024 годзе – Вадзім Храсько, Ігар Леднік, Аляксандр Кулініч).

Прыклад са сферы культуры:

У жніўні 2022 года стала вядома, што блогеру і прамоўтару гісторыі Эдуарду Пальчысу, асуджанаму на 13 гадоў калоніі ва ўмовах узмоцненага рэжыму, зрабілі больш жорсткім пакаранне і перавялі ў турму – суд адбыўся праз скайп, доўжыўся 5 хвілін.

## КРЫМІНАЛІЗАЦЫЯ ЛЮБОЙ ПРАЯВЫ САЛІДАРНАСЦІ (АД ЗАТРЫМАННЯЎ У ЗАЛЕ СУДА ДА ПЕРАСЛЕДУ ЗА АХВЯРАВАННІ І АКАЗАННЕ ПРАДУКТОВАЙ ДАПАМОГІ РЭПРЭСАВАНЫМ)

Пераслед за дапамогу пацярпелым ад рэпрэсій: ад нядопуску на судовыя пасяджэнні і затрыманняў у зале суда тых, хто прыйшоў падтрымаць абвінавачаных, пераследу за каментары ў сацыяльных сетках і распаўсюд навін пра жыццё палітзняволеных – да масавага пераследу з 2023 года **за ахвяраванні***
ў 2020 годзе ў фонды дапамогі пацярпелым ад гвалту і пераследу беларусам («BY_help», «BYSOL», «Сумленныя людзі», «Краіна для жыцця» і іншыя ініцыятывы, пасля прызнаныя «экстрэмісцкімі фарміраваннямі»). А ў 2024 годзе – **за аказанне прадуктовай дапамогі** рэпрэсаваным сем’ям (сацыяльная ініцыятыва «INeedHelpBY») і лісты палітзняволеным (Facebook-супольнасць «Лісты салідарнасці Беларусь 2020»).

Прыклад са сферы культуры:

2 ліпеня 2024 года бібліятэкарку Ірыну Пагадаеву асудзілі на 3 гады пазбаўлення волі ў калоніі за аказанне дапамогі палітзняволеным – 4-5-рублёвыя грашовыя пераводы ў СІЗА на агульную суму 188 рублёў (~ 54 еўра).

## ПАШЫРЭННЕ ГЕАГРАФІІ РЭПРЭСІЙ І ЎЗМАЦНЕННЕ ЦІСКУ НА ТЫХ, ХТО З’ЕХАЎ (ЗАВОЧНАЕ ВЯДЗЕННЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ПАЛІТЫЧНЫХ ЭМІГРАНТАЎ, НЕМАГЧЫМАСЦЬ АБМЯНЯЦЬ ПАШПАРТЫ, ПРЫЗНАННЕ ДЫЯСПАР «ЭКСТРЭМІСЦКІМІ ФАРМІРАВАННЯМІ»)

Улады Беларусі робяць захады для задушэння іншадумства як унутры краіны, так і за яе межамі. Практыка дыфамацыі і дыскрэдытацыі апанентаў рэжыму, якія выехалі з краіны і працягваюць выказвацца пра сітуацыю ў краіне, што мела месца ўжо ў 2020 годзе, дапоўнілася такімі формамі пераследу, як **ператрусы на месцы прапіскі і разгромы кватэр, завядзенне крымінальных спраў і абвяшчэнне ў міжнародны вышук**.

У сярэдзіне 2022 года ўступіў у сілу Закон «Аб змяненні Крымінальна-працэсуальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь», які ўвёў **інстытут спецыяльнага (завочнага) вядзення** паводле крымінальных спраў у дачыненні да абвінавачаных, што знаходзяцца за межамі краіны. Гэтыя нормы, і ў асаблівасці практыка іх прымянення ў Беларусі, супярэчаць базавым міжнародным стандартам крымінальнага судаводства.

У 2023 годзе ўнеслі праўкі ў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь», якія замацавалі **магчымасць пазбавіць беларусаў грамадзянства** за «экстрэмісцкую» дзейнасць; таксама беларусы замежжа **пазбаўлены магчымасці абмяняць пашпарты** за межамі краіны, прадаць нерухомую маёмасць і транспартныя сродкі паводле даверанасці, выдадзенай не ў Беларусі.

Пачатак 2024 года адзначаны **прызнаннем беларускіх дыяспар «экстрэмісцкімі фарміраваннямі»**, некалькімі групавымі крымінальнымі справамі і ўсплёскам паведамленняў Следчага камітэта пра завядзенне крымінальных спраў у рамках спецыяльнага вядзення: станам на 21 чэрвеня такія справы пачаты ў дачыненні да 108 асоб (на іх маёмасць накладзены арышт, пасля яна можа быць рэалізавана дзяржавай супраць волі грамадзян). Таксама ўсё больш крыміналізуюцца сувязі паміж тымі, хто з’ехаў, і тымі, хто застаўся ў краіне, пераслед пашыраецца на сваякоў палітычных эмігрантаў.

Прыклад са сферы культуры:

Першы прысуд у рамках спецвядзення – завочнага суда ў дачыненні да дзеяча культуры – быў ажыццёўлены 6 сакавіка 2023 года. Павел Латушка, палітычны і грамадскі дзеяч, міністр культуры Беларусі (2009–2012), пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ЮНЕСКА (2012–2019), генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы (2019–2020), завочна асуджаны на 18 гадоў калоніі.

* У пачатку 2024 года Следчы камітэт падзяліўся вынікамі працы ў рэалізацыі механізму «вызвалення ад крымінальнай адказнасці асоб, якія ўчынілі фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці, аднак з’явіліся з пакаяннем і загладзілі зробленую шкоду»: так, паводле вынікаў 2023 года сума выплачаных у бюджэт «дабрачынных» ахвяраванняў ужо перавысіла 37 мільёнаў беларускіх рублёў (~ 11 000 000 еўра).


© БЕЛАРУСКІ ПЭН

## АБМЕЖАВАННІ НА ВЫЕЗД З КРАІНЫ / УЗМАЦНЕННЕ ПРАВЕРАК І КАНТРОЛЮ НА МЯЖЫ (АД ПРАЦЭДУРЫ ДАДАТКОВАГА НАДГЛЯДУ «ПАВОДЛЕ ПРАТАКОЛА» ДА МАСАВАЙ ПРАВЕРКІ ТЭЛЕФОНАЎ)

З 2021 года беларусы, якія згаданы ў базе МУС пад назвай «Беспарадкі» (інфармацыя пра арыштаваных паводле артыкула 24.23 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях – былы 23.34 – і некаторых іншых), пачалі заназаваць дастаткова зневажальную **працэдуру дадатковага надгляду** ў пунктах памежнага кантролю падчас перасячэння дзяржаўнай мяжы падчас вяртання ў Беларусь. У адных выпадках такі надгляд праходзіць досыць тактоўна, у іншых даходзіць да пераварочвання рэчаў і раздзявання таго, каго наглядаюць, дагала. У пачатку 2023 года пачала з'яўляцца інфармацыя пра **ўзмацненне праверак на мяжы** – дадаліся «размовы» з прадстаўнікамі сілавых структур і праверка мабільнага тэлефона на прадмет падпісак на незалежныя СМІ і іншыя супольнасці, унесеныя ў спіс «экстрэмісцкіх матэрыялаў»; вывучэнне спісу кантактаў у тэлефоннай кнізе, гісторыі браўзера, фотаздымкаў. Закранае такая праверка значна шырэйшае кола людзей. Паводле звестак праваабарончага цэнтра «Вясна», у 2023 годзе пасля праверак на мяжы былі затрыманы не менш за 207 чалавек.

Вядома, што з восені 2022 года абмежаваны выезд з Беларусі **былых палітычных зняволеных**, якія выйшлі з месцаў пазбаўлення волі. Закон № 268-З ад 11 траўня 2023 года дазволіў Камітэту дзяржаўнай бяспекі забараняць выезд з краіны на тэрмін да шасці месяцаў асобам, чый ад'езд «супярэчыць інтарэсам нацыянальнай бяспекі».

Прыклад са сферы культуры:

Бард Аляксандр Баль, у 2021 годзе звольнены паводле палітычных матываў з Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра пасля 26 гадоў працы, у чэрвені 2023 года быў затрыманы на мяжы пасля праверкі мабільнага тэлефона і атрымаў 15 сутак адміністрацыйнага арышту за «распаўсюд экстрэмісцкіх матэрыялаў».

## ДАЛЕЙШАЯ ЛЕГАЛІЗАЦЫЯ РЭПРЭСІЙ І НАРОШЧВАННЕ МАШТАБУ ЦЭНЗУРЫ («НІДЗЕ НЕЛЬГА ВЫКАЗАЦЦА – ЛЮДЗІ НАВАТ УЖО НА КУХНЯХ БАЯЦЦА ВЫКАЗАЦЦА»[10])

З 2022 года атрымала шырокае развіццё практыка задушэння іншадумства праз прымяненне антыэкстрэмісцкага заканадаўства ў дачыненні да апанентаў рэжыму. Пералікі асоб, нібыта датычных да экстрэмісцкай або тэрарыстычнай дзейнасці, спісы «экстрэмісцкіх фарміраванняў» і «экстрэмісцкіх матэрыялаў» рэгулярна папаўняюцца новымі прозвішчамі і найменнямі – рэжым пераследуе «на законных падставах».

Паводле падлікаў Беларускага Хельсінкскага камітэта, каб легалізаваць рэпрэсіі, толькі ў 2023 годзе ў краіне **змянілі больш за 30 законаў** і іншых нарматыўных прававых актаў: цяпер заканадаўча замацаваны «правільныя» грамадзянская супольнасць, партыі, грамадскія і рэлігійныя арганізацыі; скасавана магчымасць ствараць асобныя школы і дашкольныя ўстановы з выхаваннем і навучаннем на мове меншасці; абмежаваны ў правах беларусы за мяжой; унесены змены, якія дазваляюць забараніць дзейнасць замежных СМІ на тэрыторыі краіны; уведзена смяротнае пакаранне за здраду дзяржаве, здзейсненую службовай асобай або вайскоўцам, і іншыя змены.

Тое ж адбываецца ў сферы культуры: у 2022 годзе істотна абноўлены Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры, у якім быў відазменены кожны другі артыкул (126 з 257). У прыватнасці, дакумент паклаў пачатак стварэнню рэестраў арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў і Нацыянальнага рэестра экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, у атэстацыі якіх закладзены першапачаткова дыскрымінацыйныя механізмы.

На працягу 2023 года адбылося далейшае **ўзмацненне заканадаўча замацаванай цэнзуры і дыскрымінацыі**, якія закранулі экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, рамеснікаў, уладальнікаў аграсядзіб, выдаўцоў, аматараў аэрафотаздымкі, ізноў арганізатараў культурна-

[10] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2024 года.

відовішчных мерапрыемстваў. Рэгуляванне працы апошніх добра ілюструе працэс усталявання кантролю над незалежным[11] сектарам культуры і нарошчванне маштабу цэнзуры. Так, у жніўні 2023 года, праз год пасля ўвядзення «Рэестра арганізатараў культурна-відовішчных мерапрыемстваў», у ім былі 706 арганізатараў (737 найменняў, з якіх 31 меў пазнаку «выключаны»), пасля ўзмацнення жорсткасці патрабаванняў восенню 2023-га – 45[12] (56 найменняў і 11 «выключаных»). **45 дазволеных Міністэрствам культуры арганізатараў на краіну з больш чым 9-мільённым насельніцтвам!**

Прыклад са сферы культуры:

«Калі казаць пра сітуацыю ўнутры краіны, напэўна, я б назвала такім вырашальным у чымсьці закон пра рэестр, таму што гэта стала дадатковай такой перашкодай у выхадзе да гледача»[13].

## НЕГАТЫЎНЫЯ ТРЭНДЫ НАЗІРАЮЦЦА І Ў ТАКІХ ТЭНДЭНЦЫЯХ, ЯК[14]:

- стыгматызацыя беларускай нацыянальнай сімволікі і ачарненне нацыянальнай культуры;
- узмацненне расійскага ўплыву; антызаходніцтва;
- пераслед за антываенную пазіцыю і любыя формы выказвання, адрозныя ад ідэалогіі дзяржавы; мілітарызацыя;
- запалохванне насельніцтва і заахвочванне даносаў;
- пераслед былых палітзняволеных; абмежаванне публічнасці судовых разбораў;
- эканамічны ціск на насельніцтва; забарона на прафесію;
- іншыя.

[11] Арганізатары з ліку дзяржаўных органаў і дзяржарганізацый не патрабуюць уключэння ў згаданы рэестр.

[12] Станам на канец чэрвеня 2024 года.

[13] З інтэрв'ю з дзеячам (дзеячкай) культуры вясной 2023 года.

[14] Трэнды дзяржпалітыкі ў галіне правоў чалавека'23.


© БЕЛАРУСКІ ПЭН

# ДЗЕСЯЦЬ АБСУРДНЫХ ПРЫКЛАДАЎ ПАРУШЭННЯ КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ І ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ДЗЕЯЧАЎ КУЛЬТУРЫ

Прыведзеныя ніжэй факты праследу размешчаны ў хcraналагічным парадку.

## 1. ПЕРАСЛЕД ЗА ЎДЗЕЛ У МІРНЫХ СХОДАХ: «ЯК СЭРЦА?»

Дзмітрый Строцаў, адзін з найбольш публічных паэтычных галасоў беларускіх пратэстаў, 21 кастрычніка 2020 года выйшаў з дому – і знік. Пазней стала вядома, што яго затрымалі недалёка ад дома, загрузілі ў мікрааўтобус, надзелі кайданкі, а на галаву – мяшок. *«Адзін да мяне нахіліўся і спытаў спачувальна: "Як сэрца?"»* Даставілі ў галоўнае ўпраўленне КДБ (!), потым – у раённае аддзяленне міліцыі. Суд пастанавіў арыштаваць на 13 сутак паводле артыкула 23.34 Кодэкса аб адміністрацыйных парушэннях («Удзел у несанкцыянаваных мерапрыемствах«) за ўдзел у адной з кастрычніцкіх мірных акцый нязгоды і пратэсту[15]: *«4 кастрычніка 2020 года ў перыяд часу з 15:00 гадзін да 15:15 гадзін… рухаўся разам з іншымі ўдзельнікамі згаданага вулічнага шэсця, якія трымалі ў руках бел-чырвона-белыя сцягі і выкрыквалі лозунгі: "Жыве Беларусь!" і "Адыходзь!"…»* (вытрымка з пратакола затрымання).

## 2. ПЕРАСЛЕД ЗА ТВОРЧАСЦЬ: «ГРАЎ МУЗЫКУ»

Джазмен Павел Аракелян быў затрыманы ўвечары 7 лістапада 2020 года пасля выступу на адным з дваровых канцэртаў у Мінску: *да машыны, у якой прыяцель падвозіў музыку пасля выступу, выскачыў гурт амапаўцаў, яны пачалі тузаць ручкі дзвярэй і крычаць, што разаб'юць шкло. Потым паклалі абодвух тварам у асфальт і запхнулі ў серабрысты мікрааўтобус. Паўла Аракеляна адвезлі ў Маскоўскае РУУС, а затым у ізалятар на Акрэсціна*[16]*. 9 лістапада суд пастанавіў арыштаваць музыку за ўдзел у дваровым канцэрце на 15 дзён з фармулёўкай у пратаколе, што той «граў музыку, чым выказваў нязгоду з дзейнай уладай»*.

## 3. ЦЭНЗУРА: «ПОНЯТНО»

Восенню 2020 года сваякі адваката, паэта, барда Максіма Знака[17], які з 9 верасня 2020 года зняволены за сваю прафесійную дзейнасць, атрымалі ліст з СІЗА, у якім быў невялікі верш, практычна цалкам замаляваны ручкай, – турэмны цэнзар пакінуў у ім толькі слова «Зразумела».

## 4. ПЕРАСЛЕД ЗА НАЦЫЯНАЛЬНУЮ СІМВОЛІКУ: «ЯК ЭКСКУРСІЯ, СПАДАБАЛАСЯ?»

21 сакавіка 2021 года малодшы навуковы супрацоўнік музея Вялікай Айчыннай вайны Юрый Куўшынаў быў затрыманы ў цэнтры Мінска і арыштаваны на 15 сутак. Раней у той нядзельны дзень ён зладзіў у музеі аглядную экскурсію для курсантаў факультэта ўнутраных войскаў Ваеннай акадэміі, на якой сярод іншага падрабязна расказваў пра бел-чырвона-белы сцяг – *«здаецца, слухалі вельмі ўважліва»*. Пазней тыя самыя курсанты і іх начальнік вярталіся ў сваю часць на метро, дзе ўбачылі на заплечніку ў аднаго з пасажыраў значок з «Пагоняй» на фоне бел-чырвона-белага сцяга, і выклікалі на яго нарад АМАПа. Гэтым пасажырам быў Юрый Куўшынаў[18].

## 5. ПЕРАСЛЕД ЗА ВЫКАЗВАННЕ ДУМКІ: «АБАРАНЯЎ СЯБЕ І СВАЮ СЯМ'Ю»

Імя настаўніцы музыкі Аксаны Каспяровіч значыцца пад № 818 у «Пераліку арганізацый і фізічных асоб, датычных да тэрарыстычнай дзейнасці» – спісе КДБ, які змяшчае прозвішчы «міжнародных тэрарыстаў». Каментарыі Аксаны Каспяровіч у Instagram, за якія яна адбыла 1 год і 2 месяцы калоніі і ў Беларусі лічыцца ў спісе «тэрарыстаў», тычыліся рэзананснага

[15] Затрымалі Дзмітрыя Строцава.

[16] Затрымалі Паўла Аракеляна.

[17] Людзі слова ў няволі_Максім Знак.

[18] Затрымалі за значок з «Пагоняй».


...зем лічыць, што ангельскаю для гэтага ліста дост...
...клад не пішу, бо непедагагічна. Хіба што ў каме...
Пара строф – Выбачаюся, забудзеся, невялікі дада...
I і II. [redacted], але амаль не прыйш...
накладаць у верш:
[redacted]
— Понятно.
The best of the best
...эфире моя любимая рубрика, и у нас много в...
...подрубрике „О себе" я узнал, что наука о знак...

Ангел
— Ну, а ты кто такой?
— Спаситель…
— ОСВОД?
— Нет, я Ангел!
(Смешок внезапный)
— За что тут оказался?
— Спасал…
— Кого?
— Я спасал Беларусь…
— Понятно.

забойства супрацоўнікамі КДБ IT-спецыяліста Андрэя Зельцэра[19] і былі наступнага зместу: *«Паглядзела відэа захопу кватэры і зразумела: чарговае бяспраўе! Як жа шкада хлопца, які абараняў сябе і сваю сям'ю»*, *«Супрацоўнік ведаў, на што ішоў. Яму за гэта немалыя грошы плацяць, праца яго такая. А на месцы хлопца са стрэльбай мне таксама было б страшна за сябе і сваю сям'ю((»*[20].

## 6. УМОВЫ ЎТРЫМАННЯ Ў ЗАКРЫТЫХ УСТАНОВАХ: «КАЛІ Ў НАС БІБЛІЯТЭКА?»

Публіцыст, блогер, анархіст Мікалай Дзядок[21] быў затрыманы за сваю грамадзянскую пазіцыю ў лістападзе 2020 года і пазней асуджаны на 5 гадоў калоніі. Прайшоў праз збіццё, электрашокер, карцар, ШІЗА, ПКТ і іншыя катаванні. Напрыклад, у красавіку 2022 года Мікалая ўтрымлівалі 9 дзён у ШІЗА за тое, што ў шпацырным дворыку ён спытаў у зняволеных з суседняй камеры: *«Калі ў нас бібліятэка?»*

## 7. ПЕРАСЛЕД ЗА РАСПАЎСЮД ІНФАРМАЦЫІ: «КРАІНА Ў СЛЯЗАХ»

У ліпені 2022 года галоўнай рэдактарцы газеты «Новы Час» Аксане Колб, у чэрвені 2021 года асуджанай на падставе аднаго фотаздымка на 2,5 года «хіміі» за ўдзел у маршы 16 жніўня 2020 года, прысудзілі яшчэ 13 дзён арышту за тое, што ў траўні 2021 года яна перапосціла на сваёй Facebook-старонцы песню «Краіна ў слязах», размешчаную на YouTube-канале «Belsat»[22].

## 8. РЭПРЭСІІ Ў КНІЖНАЙ СФЕРЫ: «"ВЫЗВАЛЕНЫЯ" І ЗАНЯВОЛЕНЫЯ»

У красавіку 2023 года дзеянне пасведчання аб рэгістрацыі індывідуальнага прадпрымальніка Змітра Коласа, дзякуючы якому за больш чым 30-гадовую дзейнасць выдавецтва «Зміцер Колас» кніжны рынак Беларусі папоўніўся сусветнай літаратурай у найлепшых беларускіх перакладах, было спынена на падставе пазову Міністэрства інфармацыі. Нагодай зрабілася кніга доктара гістарычных навук Аляксандра Смаленчука «"Вызваленыя" і заняволеныя» – зборнік гістарычных дакументаў з дзяржаўных архіваў Беларусі. Выйшла яна ў 2021 годзе, нідзе не прадавалася, у 2023 годзе трапіла ў спіс «экстрэмісцкіх матэрыялаў».

## 9. ПЕРАСЛЕД ЗА ДАНАТЫ: «НЕ Я ПЕРШАЯ, НЕ Я АПОШНЯЯ»

Гэта словы адной з дзеячак культуры, прамоўленыя пасля званка супрацоўніка КДБ, які «запрасіў» яе на размову з нагоды ахвяраваных у 2020 годзе 15 долараў у адзін з фондаў дапамогі пацярпелым ад рэпрэсій (пасля прызнаны «экстрэмісцкім фарміраваннем»). Пагражаючы крымінальным пераследам, з 2023 года беларусаў масава выклікаюць у КДБ і ДФР і прапануюць адкупіцца: перавесці на адзін з прапанаваных следчым банкаўскіх рахункаў суму, якая ў 10-1000 разоў перавышае зробленае некалькі гадоў таму ахвяраванне:

19 28 верасня 2021 года супрацоўнікі КДБ уварваліся ў мінскую кватэру да IT-спецыяліста Андрэя Зельцэра, у перастрэлцы загінулі гаспадар кватэры і супрацоўнік КДБ Дзмітрый Федасюк.

20 «Да палітвязняў ставяцца горш, чым да забойцаў».

21 Людзі слова ў няволі_Мікола Дзядок.

22 13 «сутак» за перапост песні «Краіна ў слязах».


© БЕЛАРУСКІ ПЭН


Последняя добровольно сообщила об одном денежном переводе [redacted] экстремистскому формированию «BYSOL» в сумме [redacted] долларов США (отобрана явка с повинной), дала подробные пояснения, приложила скриншоты со сведениями о названном переводе (выписка по счету), сведения о переводах ее аккаунта в интернет-ресурсе «Facebook»), а также копию карт-чека о пожертвовании денежных средств на благотворительный счет ГУ «РНПЦ детской онкологии, гематологии и иммунологии» в сумме [redacted] рублей, в качестве добровольного возмещения ущерба и желания загладить вину.

500 долараў – узамен за данат 5 долараў, 1000-2000-5000 долараў – за ахвяраванні 10, 23, 48 долараў і г. д. Такія пераводы непрацэсуальныя і не даюць ніякіх гарантый, што крымінальны пераслед паводле арт. 361-2 Крымінальнага кодэкса («Фінансаванне экстрэмісцкай дзейнасці») не будзе пачаты паўторна.

## 10. БЕЗ ПРАВА НА ТВОРЧАСЦЬ, БЕЗ ПРАВА НА ЖЫЦЦЁ: «ПАЛАТНО, АЛЕЙ»

Ноччу 11 ліпеня 2023 года ў выніку жорсткіх умоў утрымання ў зняволенні і неналежнай медыцынскай дапамогі пры прабадной язве памёр палітзняволены мастак Алесь Пушкін[23]. У сакавіку 2022 года Алесь Пушкін быў асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі ў калоніі строгага рэжыму за партрэт Яўгена Жыхара[*] («2014 г., палатно, алей, інсталяцыя-рама, ~ 140x120 см»)[**].



Фота: Janak Kouzel

[23] Супольная заява праваабарончай супольнасці Беларусі з нагоды смерці ў зняволенні мастака Алеся Пушкіна.

[*] Антысавецкі партызан.

[**] З ліста Алеся Пушкіна «Чаму я напісаў партрэт Аўгена Жыхара».

«Быў час, калі перад пачаткам вайны было нібы зацішша. Але пасля пачатку вайны людзей пачалі браць за выказванні пра вайну. Калі былі выбары мясцовыя дэпутацкія [люты 2024 г.], пачалася яшчэ адна хваля арыштаў і штрафаў, бо ў Беларусі няма грошай – сілавікам з чагосьці патрэбна выдаваць заробкі. Каб выплочваць ім высокія заробкі, яны пачалі чысціць людскія кішэні. Усіх запар. А цяпер чакаюцца выбары Лукашэнкі і прэсуюць людзей па-чорнаму»[24].

5 траўня 2023 года ў віцебскай калоніі памёр блогер і культурны менеджар Мікалай Клімовіч, у лютым асуджаны на год калоніі, нягледзячы на інваліднасць II групы па сэрцы. Здзейсненае ім злачынства – рэакцыя «смешна» на сатырычную выяву Лукашэнкі ў стужцы сацыяльнай сеткі «Аднакласнікі». **Гэтая трагічная гісторыя – усяго адна з сотняў і тысяч выпадкаў сістэматычнага і мэтанакіраванага задушэння іншадумства і грамадзянскіх свабод.**

Рэпрэсіямі і татальным страхам рэжым Лукашэнкі працягвае ўтрымліваць уладу. Для легалізацыі сваіх дзеянняў нелегітымная ўлада змяняе законы, а залежная судовая сістэма актыўна ўдзельнічае ў рэпрэсіях, ігнаруючы стандарты справядлівага суда.

Становішча ў галіне правоў чалавека ў Беларусі – катастрафічнае, што адзначана аўтарытэтнымі міжнароднымі арганізацыямі. І сітуацыя пагаршаецца, што пацвярджаюць міжнародныя і нацыянальныя індэксы і рэйтынгі.

Мы заклікаем міжнародную супольнасць звярнуць пільную ўвагу на тое, што адбываецца, і зрабіць захады для абароны правоў чалавека ў Беларусі. З рэкамендацыямі ад культурных арганізацый можна азнаёміцца тут.

[24] З непублічнага інтэрв'ю з дзеячам (дзяячкай) культуры вясной 2024 года.


© БЕЛАРУСКІ ПЭН

© БЕЛАРУСКІ ПЭН

© БЕЛАРУСКІ ПЭН